УДК 94(477)323.22

*Ніна Стужынская*

●

# ЯНКА ГАЛАК. ГІСТОРЫЯ ВАЯВАННЯ І ПЕРСОНА: АГЛЯД КРЫНІЦ.

## *Постаць народнага важака: агульнае і асабістае*

*У статті йдеться про селянське повстання на Чернігівщині та Гомельщині в 1920–1921 рр. під керівництвом отамана Івана Галаки, одного з суперечливих діячів періоду Громадянської війни, що охопила територію колишньої Російської імперії. На основі документів, що зберігаються в архівах Білорусі, показано, що збройна діяльність отамана Галаки носила антирадянський характер, йдеться про прояви антисемітизму і єврейських погромах як поширеного явища того часу, що супроводжували селянські повстання, спрямовані проти Радянської влади.*

***Ключові слова:*** *селянські повстання, отаман Галака, більшовицький режим, антисемітизм.*

Янка Галак, герой украінскай і беларускай гісторыі, фігура, як вынікае з розных крыніц, вельмі спрэчная. Але ён не выключэнне з галерэі вядомых ва Украіне і Беларусі паўстанцкіх і партызанскіх лідараў эпохі рэвалюцый і грамадзянскай вайны. Лакальные войны, якіе яны самі арганізавалі ў барацьбе за ўладу, былі па сутнасці для іх сацыяльным ліфтам, полем магчымасцяў для рэалізацыі амбіцый.

Галак, вакол фігуры якога і да сённяшняга дня раз пораз разготваецца полымя жарсцяў, прадстаўляе даволі тыповы ўзор сялянскага тагачаснага важака і валодае абсалютна стандартным наборам рысаў, якія былі ўласцівы ваенным лідарам эпохі вялікай сацыяльнай калатнечы. Па-першае, трэба адзначыць наяўнасць моцнага характару, здольнасць падпарадкоўваць сабе людзей, «харізматычны», як сказалі б сёння. Па-другое, адданасць выбару, нават пачуццё месіянства, адказнасці за сваіх прыхільнікаў і паслядоўнікаў (якасці, да рэчы, незаўсёды абавязковыя для такога тыпу лідараў), за тую сацыяльную групу, з якой выйшлі самі. Моцна ўкаранены ў сваю малую радзіму Галак быў моцна звязаны з асяродкам, які вылучыў яго лідарам, па месцу нараджэння, паходжання і сваяцкіх сувязяў. Як правіла атаманы, якіе былі ў стане збіраць вакол сябе за кароткі тэрмін сотні-тысячы чалавек, карысталіся маральным аўтарытэтам ў асяродку, які дэлегаваў яму ўладные паўнамоцтвы. Гісторыя яго гібелі сведчыць пра тое, што ён быў простым са сваім аттачэннем і даступным у камунікацыях. Калі б гэта было не так, фінал яго жыцця выглядаў б інакш.

Час быў глыбока канфліктны, без устойлівых арыентыраў. Таму можна назіраць пэўную «гнуткасць» маральных перакананняў і нормаў. Гэта – здольнасць праліваць чужую кроў, пры неабходнасці здрадзіць часоваму саюзніку, ці змяніць яго, адмовіцца ад узятых на сябе абавязкаў, як правіла не перад сваімі.

Ён, як сведчыць баявая гісторыя атамана, меў досвед знаходжання ў экстрэмальных сітуацыях: удзел у баявых дзеяннях, рабаўніцкіх і разбойных нападах, існаванне ў лясных, далёкіх ад нармальнага побыту, ўмовах і г. д.

---

© Стужынская Ніна Іванаўна – беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Асацыяцыя незалежных гісторыкаў (Менск, Беларусь).

Вельмі часта народныя верхаводы мелі знешнюю прывабнасць (калі Галак сапраўды прысутнічае на распаўсюджаным фота, гэта яшче адзін доказ такой высновы), мускульную моц і сілу духа, высокі балявы парог. Немалаважная рыса ў партызанскім жыцці – талерантнасць да алкаголю.

Фігура Галака лёгка параўноўваецца з іншымі сялянскімі верхаводамі, якіе на пачатку 1920-х гг. стваралі баявые адзінкі і змагаліся супраць бальшавікоў, прытрымліваючыся пэўных палітычных поглядаў і пераваг. Не гледзячы на недахоп і цяжкадаступнасць крыніц удалося рэканструяваць жыццяпісы каля трох дзесяткаў выбітных беларускіх кіраўнікоў узброенай антыбальшавіцкай апазіцыі з больш чым 200 асобаў.

Відавочна, што атаманская постаць, – не простая «героічная», «памяцевытворчая» фігура агульнадзяржаўнага ўзроўню, здольная служыць падмуркам канструіравання гістарычнай памяці ў сучасных умовах, калі яшче цяжка адмовіцца ад савецкай спадчыны. Яны «неудобные», і пакуль прымальные не для ўсяго грамадства, часцей за ўсе аб'ект палітычных маніпуляцый. Афіцыйная беларуская гістарыяграфія нават выключае іх з пісанай гісторыі, ці карыстаецца старымі савецкімі штампамі – «бандыты», кулацкае ахвосце і г. д

Рэканструкцыя жыццяпісаў такіх герояў як Галак патрабуе дасканалай працы па выяўленню архіваў, параўнанню з існуючымі крыніцамі інфармацыі, асцярожнага падыходу да мітаў, якіх існуе вялікая колькасць. Пэўным чынам постаць Галака «легендзіравана» мітамі, ў якіх з аднаго боку ён прадстаўлены як бяспрэчны герой, з другога – неміласэрны антысеміт і кат. Палітвязень Рыгор Клімовіч, удзельнік паўстанцкага руху ў Гулагу, распавядаў у 1990-е гг. пра нейкага настаўніка Янку Галака, які змагаўся з бальшавікамі да 1929 г., пра «дуб Галака» на Гомельшчыне, як сваеасаблівы знак народнай памяці. Разам з тым нямала успамінаў, у тым ліку і друкаваных, якіе малююць атамана выключна карнай антысеміцкай фігурай.

***Крыніцы ў архівах Беларусі.***

Са зняццем грыфу сакрэтнасці і адкрыццем фондаў рэвалюцыйных трыбуналаў крынічная база па даследаванню паўстанцтва ў Беларусі значна пашырылася. Для навукоўцаў цікавасць уяўляюць у першую чаргу крыницы карных органау: следчыя і судовыя матэрыялы рэвалюцыйных ваенных трыбуналаў, персанальныя і групавыя (на вёскі цалкам) следчыя матэрыялы сялян, удзельнікаў антысавецкай партызанкі; даклады и агентурные зводки ЧК. Матерыялы даюць магчымасць высветліць профіль удзельнікаў аддзелаў, матывацыю удзелу ў акцыях, адносіны розных груп насельніцтва і ўлады да дзеянняў і асабіста Галака. Следчыя справы даюць карціну таго, што адбывалася, напрыклад дэталізацыю нападу на м. Паддабранка. Пратакол паседжання Маркавіцкага выканкама ад 20 лютага 1921 г. «О разгроме м. Паддабрянка бандой Галакина» – вельмі каштоўная крыніца, пакольку адлюстроўвае карціну падзей, што называецца, па «гарачых слядах». Дакумент падае праўдзівые лічбы – колькасць нападнікаў і ахвяр, сапраўдные імёны людзей, акалічнасці падзеі.

З крыніцы вынікала, што 17 лютага 1921 г., баючыся расправы (так яны тлумачылі свае паводзіны следству), члены выканкама м. Паддабранкі пакінулі выканкам, за імі ў паніцы пабеглі людзі ў накірунку Маркавіч. Міліцыянты скінулі форму, пераапрануліся ў сялянскую вопратку і паехалі ў Падабранку з мэтаю выведкі. Там, як яны потым распавялі следчаму ЧК, ўбачылі ў центры некалькі падвод, вакол натоўп узброеных людзей, якія распалілі вогнішча ў центры мястэчка, парабілі факелы і пачалі разбегацца па вуліцах і кідаць іх у разбітые вокны хат. У ноч з 19 на 20 лютага Пададабранка была ў полымі[1]. Аперацыя папярэдне рыхтавалася, ў Паддабранку была заслана выведка. «Калі выведка вярнулася, то ў кузніцы паставілі 2 кулямёты і пакінулі 6 кулямётчыкаў. Аддзел накіраваўся па дарозе на Дабранку, на сярэдзіне шляху паставілі яшче 2 кулямёты, а калі вярталіся, то з маста зноў выслалі выведку». Пры ўваходзе ў Паддабранку адкрылі кулямётны агонь па дамах. Калі ж зразумелі, што чырвоных частак ў мястэчку няма, то «досталі тапары і пачалі бурыць кааператыўную лаўку, а потым дамы. На вазы грузілі скуры, абутак, футры і інш. рэчы». Потым сышлі на Гарнастаеўку.

Карціну нападу дапаўняюць паказанні ўдзельнікаў пагрому, укрывальнікаў Галака, жыхароў мястэчка і навакольных вёсак. Як сведчаць крыніцы, кіраўніцтва выканкама спрыяла нападнікам і было пакарана за «непрыняццё мераў супраць рабаўніцтва і падпальвання, за супрацьдзеянне эвакуацыі жыхароў Паддабранкі»[2]. Старшыня выканкама Нюхняеў нават ведаў, што напад рыхтуецца. Начальнік міліцыі Душко і міліцыянт Васіленка на судовым працэсе 29–31 сакавіка 1921 г. былі асуджаны да расстрэлу за садзейнічанне бандзе. Міліцэйскае кіраўніцтва забяспечвала Галака неабходнай інфармацыяй. Пасля першага нападу на Паддабранку, сведчыў прысуд: «начальнік міліцыі Душко паслаў Васіленко са скруткам і харчамі да палітработніка Драздова». Тут узгадваецца нейкі таямнічы Драздоў, імаверны кіраўнік ці крыніца інфармацыі для яўна несавецкіх выканкамаўцаў. Можна з асцярожнасцю меркаваць, што Янка Галак меў пэўныя сувязі з Заходнім (Гомельскім) камітэтам Народнага саюза абароны радзімы і свабоды пад кіраўніцтвам вядомага расійскага палітыка баевіка, эсэра Барыса Савінкава. Разгалінаваная арганізацыйная сетка Народнага саюза на той момант хутка стваралася на беларускіх тэрыторыях. Узгаданы Драздоў мог выконваць ролю каардынатара.

Такім чынам, гэтыя высновы следства ЧК і судовыя прысуды – сведчанне вельмі хісткай пазіцыі савецкай улады, адсутнасці аўтарытэту і легітымнасці ў вачах вяскоўцаў. Галак, інтэграваны ў пэўныя арганізаваныя антысавецкія структуры, трымае паралельную ўладу, якая абапіраецца на падтрымку часткі насельніцтва.

Следства выявіла, што ў мясцовасці на той момант дзейнічала «банда – па паказаннях міліцыянта Змітра Васіленкі – 120 чалавек, палова кавалерыі на добрых конях, сваіх павозак (мела) 20 і 10 сялянскіх. На 7 павозках перавозілі вінтоўкі і кулямёты. Чалавек 15 мелі аўтаматы, ў некаторых бомбы і па 2 рэвальвера...».

Карціна ўварвання галакоўцаў у мястэчка выглядае так: «30–40 вершнікаў узброеных вінтоўкамі со штыхамі ў суправаджэнні 15–20 падводаў знаходзіліся ў Паддабранцы каля 3-х гадзін...». У першую чаргу рабавалі дзяржаўныя ўстановы. Калі на мястэчка ў нядзелю 20 лютага быў здзейснены другі напад, то галоўнымі рабаўнікамі былі ўжо сяляне навакольных вёсак – пасада Дабранкі, сёлаў Маркавічы, Гарнастаеўкі, Гадзічава, Уладзіміраўкі і інш. Усяго следчыя налічылі ад 3 да 5 тысяч удзельнікаў крывавай акцыі. Нарабаванае дабро вывозілі на санях, выносілі ў вялікіх вузлах.

Канешне, галоўнае пытанне, якое паўстае адразу, гэта – пытанне матывацыі ўдзелу ў жахлівай справе. Чаму не спрацавалі маральныя і інш. чалавечыя прынцыпы. Ахвяры – 9 яўрэяў – безабаронныя і даступныя ў якасці лёгкага здабытку людзі. Іх гібель ахвярна-сімвалічна ў вачах сялян. Яны прынялі смерць толькі за тое, што савецкая ўлада мела па перакананню мясцовых людзей выразны нацыянальны твар. Вясковыя людзі, маёмасць якіх была ўшчэнт разбурана вайной, татальнымі паборамі вайскоўцаў розных армій, асабліва чырвонай харчразвёрсткай, пазбавіліся ад шмат якіх маральных абмежаванняў. Сама ўлада паводзіла сябе ў адносінах да насельніцтва як рабаўнік. Сістэма маральных каштоўнасцяў, вертыкальныя і гарызантальныя сувязі, сямейныя і суседскіе ў мясцовых супольнасцях былі моцна парушаны.

Пасля «аперацыі» ў клубе наладзілі выпіўку. Пад час следства з нарабаванага «ў Марыі Абразцовай адабралі дамскае паліто», ў Апанаса Грыгор'ева – кравецкую машынку». Трэба адзначыць, што некаторые ахвяры пагрому падчас следства з прычыны ці то страху, ці то міласэрнасці паказвалі, што «пазычылі» тую ці іншую рэч знаёмым. Такім чынам крымінальная справа ЧК і судовыя дакументы Рэўваентрыбунала 1921 г. сведчаць, што палітыка ваеннага камунізму нарадзіла жудасныя праявы супрацьстаяння, канфліктаў, у тым ліку і ўзброеных, сярод людзей адной супольнасці, за плячыма які шмат гадоў сумеснага дабрасуседскага жыцця.

*Крыніцы таксама карных органоў, дакументы карных ваенных экспедыцый захоўваюць некаторые фонды Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь.* Адна са спраў фонда 60 утрымлівае даволі падрабязную інфармацыю аб дзеяннях зводнага камуністычнага атрада 17 Ніжагародскай чырвонасцяжнай дывізіі па ліквідацыі банд Галака у Гомельскай губерні.

Сялянскі паўстанцкі рух меў такіе памеры, што пагражаў умацаванню савецкай улады. Выкарыстанне супраць узброенай апазіцыі сілы рэгулярных чырвонаармейскіх частак сведчыла пра маштабы і сур'ёзнасць пагрозы.

У ваенных зводках, якіе канцэнтравалі інфармацыю пра паўстанцкіе аддзелы і імавернага ваеннага праціўніка, ёсць пералік дыверсійных акцый групоўкі Галака. Так, «14 лютага банда Галака абезброіла атрад чырвоармейцаў у вёсцы Клубаўка ў 100 чалавек, забралі вінтоўкі, 4 кулямета, вайсковую маёмасць». (Пра забойства інфармацыі няма.) Канфіскаванай зброей забяспечылі сялян. 16 лютага атрад Галака заняў Рэпкі. Мястэчка было растраляна з 3-х кулеметаў. Спачатку выведка Галака пераканалася ў адсутнасці чырвонай арміі, потым баевікі ўвайшлі ў мястэчка. Спалілі паперы выканкама, забілі міліцыянтаў. Чутны былі воклічы: «Бей жыдов, спасай Россию!» Забітых пасля нападу налічылі каля 150 чалавек. Бачна, што забівалі тапарамі, нажамі. Сам Галак аперыраваў ў раене вёсак Папоўка, Плаван, Ярылавічы. 10 сакавіка, передае аператыўная зводка, здзейснены напад на харчатрад, чырвонаармейцаў абезброілі і адпусцілі, сышлі ў накірунку вёскі Змагарына»[3].

«12 сакавіка спалучэнне 2-х галакоўскіх аддзелаў накіравалася на поўдзень. 13 сакавіка адбылася сутычка ў раёне Вышеміжы (назва магчыма памылковая, цяжка чытэльная) з кавалерыйскім дывізіёнам, чырвоныя адступілі. Таксама 13 сакавіка 50 коннікоў зрабілі налёт на вёску Бедрыцкая (Петрыцкая, Буда – Бедрыцкая?), абезброілі 2-х чырвонаармецаў, забілі 2 яўрэяў. 1 красавіка Галак з аддзелам ў 30–40 чалавек заўважаны ў раёне Міхалёўка – Казіміраўка. 7 красавіка банда з'явілася ў сяле Мікулічы ў 11 раніцы. Бандыты забілі міліцыянта, спалілі дакументы. Забілі таксама упаўнаважанага харчкамітэту Боруха Альбінскага і яшче 12 яўрэяў»[4].

Выведка сабрала дадзеные пра лідара атрада. «Бандыт. Каля 30 гадоў. Былы дзенікінец. Потым ў складзе камандзіраў Чырвонай арміі. Сапраўднае прозвішча Іван Васільевіч Васільчыкаў. Росту сярэдняга, русы. Нежанаты. Граматны. Сямья ў Палтаве. Мае асабістага сакратара Сцяпана Байдужу (сапр. Якавенка). Жыхар Старой Паперны Ярылавічскай воласці, каля 25 гадоў, яго ўсе ведаюць».

Штаб чырвонаармейскай дывізіі падрыхтаваў таксама матэрыялы, якіе адлюстроўваюць палітычная пераканані верхавода паўстанцаў: адрозніваецца зацятым антыбальшавізмам. Лічыць савецкую ўладу незаконнай часовай, варожай сялянству, яўрэйскай па складу. Галак распаўсюджвае чуткі, што ў Маскве паўстанне супраць бальшавікоў, што ён чакае дадатковых сіл. Галак звяртаецца да сялян з заклікам не ваяваць супраць яго атрадаў. І галоўная выснова чырвоных аналітыкаў: Галак мае планы пабудаваць міліцыйную армію (народнае апалчэнне).

Выкарыстоўваючы агентуру, завербаваную ў вёсках, чырвоные мелі дадзеные аб арганізацыі і ўзбраенні аддзелаў Галака, наяўнасці і лакалізацыі складоў. «Паміж Удалёўкай і Петрыцкай (Бедрыцкай?) размешчана резервная конніца ў колькасці 20–30 чалавек». Былі сабраны паведамленні аб падрыхтоўцы Галаком да весновых баевых акцый. У Рэчыцкім павеце па сведчанню мясцовых жыхароў аддзелы Галака налічвалі да 500 чалавек пехоты і 100 конніцы, 6 кулямётаў, 1 гармата. Частка сіл сканцентравалась ў лесах на поўдзень раз'езда Бабічы[5]. Хаця паступала інфармацыя, што да весны Галак прыпыніў набор партызан і сур'ёзных аперацый не планаваў. Свярджалася, што Галак мае сувязь з арганізацыей Савінкава.

Штаб чырвоных перад пачаткам ліквідацыйнай аперацыі разглядаў прычыны резка канфліктнага становішча, адмоўнага стаўлення сялянства да ўлады. Сяляне былі абураны тым, што прымушаюць («подстрекают»), каб усю зямлю засевалі «апотым прыдуць атрады (па збору харчпадатку. – ***Аўт.***) і ўсе забяруць». Сяляне жартавалі: «Раней пень біў Івана, а зараз Іван б'ецца аб пень. Каму баліць?» Незадаволенасць злоўжываннямі савецкіх служачых (якасць ўлады), выказвалася крыўда на яўрэяў, якіе занялі большасць кіруючых пасадаў... «яны пытаюцца (сяляне. – ***Аўт.***), у чыіх руках ўлада. Што такіе злодзеі...». Сяляне, якіе падзязялі лозунгі Галака, казалі: «не суньце нам каллектываў і саўгасаў, дайце нам реформы Заходняй Европы...».

У аналітычных паперах адзаначалася таксама, што савецкая ўлада не ў стане даць адпор, што «дае магчымасць бандам Галака павялічвацца шматкроць. Што ён

мае лёгка сабраць ад 120 да 800 чалавек у кароткі тэрмін, мае ў сваім распараджэнні атрад вершнікаў і 9 кулямётаў. Сяляне лёгка паддаюцца яго ўгаворам»[6].

Савецкую ўладу моцна падрываў пануючы ў розных групах насельніцтва антысемітызм. Настрой чырвонаармейскіх частак кіраўніцтва дывізіі знайшло нездавальняючым. 139-ы полк «настроены ў вышэйшай ступені контрревалюцыйна і антісемітскі. У мірных жыхароў (яўрэяў) кідалі каменямі (будзёнаўцы. – ***Аўт.***). З падачы мясцовых партыйных функцыянераў рабілі выснову, што на самой справе Галак змагаецца не з яўрэямі, а з савецкай уладай, з камуністычнай партыяй, з працоўнымі масамі»[7].

Матэрыялы ўтрымліваюць інфармацыю пра колькасць, арганізацыю і ўзбраенне карной чырвонаармейскай групоўкі. Папярэдне атрад налічваў 120 чалавек, забяспечаных 4 кулямётамі Максім, 2 аўтаматамі Шоша, кулямётам Льюіс. У складзе групоўкі мелася 80 кавалерыстаў. Кіраўніцтва падабрана выключна з партыйных. Камандзіру была прадстаўлена неабмежаваная самастойнасць дзеянняў. Карнікі падпарадкоўваліся Ваенсавету дывізіі (старшыня – нейкі Іоська) і дыслакавалася ў Рэчыцкім павеце. З крыніц, аднак, вынікае, што зфармаваные для ліквідацыі галакоўшчіны часткі адразу пачалі «разлагацца», ў іх былі заўважаны праявы жорсткага антысемітызму. Частка карнікаў была адазвана ў другіе раёны. У вёсцы Ястрабкі з прычыны пачатку ліквідацыйнай кампаніі з'явіўся асобный аддзел і школа камандзіраў[8]. Гэты камуністычны атрад атрымаў зброю ў колькасці 120 штыкоў, 25 сабель, 7 кулямётаў, патронаў 20 тыс»[9].

Адным з галоўных пытанняў для чырвонага камандавання было пытанне тактыкі, метадаў ліквідацыі. Адкрытага фронта не існавала, таму тактыка регулярнай арміі патрабавала карэкцыі згодна з умовамі партызанскай вайны. Удзень ліквідацыя «лясных людзей» была немагчыма. Адзіны спосаб – аперацыя ў начы. Для гэтага патрабавалася выяўленне месцаў, дзе Галак мог спыняцца на ноч. Першае, што было прапанавана зрабіць, гэта – стварыць на тэрыторыях уплыву атамана агентурную сетку. Ад мясцовых уладаў да кіраўніка знішчальнай аперацыі, начальника асобага аддзела Гомельскай камісіі па барацьбе з бандытызмам Я. П. Кутафіна быў накіраваны зварот аб выдзяленні матэрыяльных сродкаў, солі, цукру, мануфактуры для «ўзнагароды» за дабраохвотную агентурную выведку і перадачу сведчанняў аб знаходжанні «бандытаў». Так, жыхары вёсак Удалёўка і Рудні Бедрыцкай атрымалі скураные гарнітуры за каштоўную інфармацыю[10].

У вёсцы Хатка знайшлі такое месца – Кіслоўскіе хутары, як магчымае для адпачынку атамана. Дзейнічалі пад выглядам галакоўцаў, рабавалі сялян, засылалі агентаў. Хутка сяляне гэтыя правакацыі разгадалі, з даверам ставіліся толькі да знаёмых.

Як кардынальные меры ліквідацыі і выкаранення галакоўшчыны выкарыстоўвалі арышты сярод жыхароў, так званых «укрывальнікаў». За другім разам «пасобнікаў і укрывальнікаў» расстрэльвалі. Практыкавалі павальные вобшукі. У Рудні Бедрыцкай былі затрыманы 4 падазроных у бандытызме, ўзята кантрыбуцыя, за ўзаемадзеянне з Галаком. Арыштаваные перадаваліся адразу упаўнаважанаму Кутафіну. Так арыштаваны і пакараны былі старшыня сельскага савету Рудні Бедрыцкай Іван Лукашоў, сакратар таго ж савета Аляксей Камзолаў, старшыня сельсавета ўжо ўзгаданай вёскі Хаткі Пётра Леляўскі[11].

Разведка ажыццяўлялася асобнымі раз'ездамі. Пры выкрыцці банды быў загад не страляць.

Захоп вёсак, якіе быццам бы занятых галакоўцамі, адбываўся па падобнаму сцэнару налётаў аддзелаў Галака. Так, перад выступленем камуністычный атрад дзяліўся на 2 групы для абхода вёскі і яе аттачэння. Абозы прыкрывалі кулямёты. Сілы злучаюліся ў вёсцы, дзе пачыналіся вобшукі, праверка дакументаў, пературасанне рэчаў жыхароў. Паток скаргаў ва ўладу сведчыць пра тое, што аперацыя суправаджалася рабаваннем сялян. Потым аддзел накіроўваўся ў другую вёску.

На мой погляд, крыніцы з беларускіх архіваў (іх нашмат больш, чым тут прадстаўлены) дапамогуць даследчыкам дапоўніць карціну развіцця і знішчэння

паўстанцтва на памежных тэрыторыях Беларусі і Украіны. Новые (ці забытые) крыніцы – важны сродак канструявання такой сацыяльнай з'явы як сацыяльные сялянскіе рухі, інструмент пазбаўлення ад прадузятасці і аднабаковасці падыходаў да гісторыі грамадзянскіх канфліктаў, спакойных узважлівых ацэнак мінулага і яго герояў.


1. Гомельскі абласны дзяржаўны архіў. Ф. 100.Воп.1. Сп.613. Арк. 56зв.
2. Цытуецца па справа Гомельскага Рэвваентрыбунала грамадзян сяла Марковічі, ўдзельнікаў пагрома і падпальвання Паддабранкі. Арк. 57-91.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф.60. воп. 3.Спр. 828. Арк. 49.
4. Тамсама. Арк.25.
5. Тамсама. Арк. 4.
6. Тамсама. Арк. 12,16.
7. Тамсама. Арк. 16.
8. Тамсама. Арк.10.
9. Тамсама. Арк.11.
10. Тамсама. Арк.16.
11. Тамсама. Арк.16,13.



*В статье речь идет о крестьянском восстании на Черниговщине и Гомельщине в 1920–1921 гг. под руководством атамана Ивана Галаки, одного из противоречивых деятелей периода гражданской войны, охватившей территорию бывшей Российской империи. На основе документов, хранящихся в архивах Беларуси, показано, что вооруженная деятельность атамана Галаки носила ярко выраженный антисоветский характер, говорится о проявлениях антисемитизма и еврейских погромах как распространенном явлении того времени, сопутствовавшем крестьянским восстаниям, направленным против Советской власти.*



***Ключевые слова:*** *крестьянские восстания, атаман Галака, большевистский режим, антисемитизм.*



*The article focuses on the peasant uprising in Chernihiv and Gomel region in 1920-1921 under the leadership of Ataman Ivan Galaka, one of the controversial figures of the period of the civil war that has engulfed the territory of the former Russian Empire. On the basis of documents kept in the archives of Belarus, it is shown that the armed activities Ataman Galaka had an obvious anti-Soviet character, speaks of anti-Semitism and anti-Jewish pogroms as a widespread phenomenon at that time, was accompanied by a peasant uprising against Soviet rule.*



***Keywords:*** *peasant revolts, Ataman Galaka, Bolshevik regime, anti-Semitism.*